http://edoc.bseu.by:8080

***Н.Г. Сідар***
г. Мінск

# АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНЫ І ВЫХАВАЎЧЫ АСПЕКТ У ВЫКЛАДАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ТЭХНІЧНЫМ ВУЗЕ

Галоўнай задачай вышэйшай школы з'яўляецца падрыхтоука высокакваліфікаваных спецыялістаў розных галін навукі. Аднак для фарміравання гарманічна развітай асобы патрэбны таксама высокая культура, высокія маральныя прынцыпы і шырокі спектр агульнаадукацыйных ведаў. Усе гэтыя праблемы паспяхова вырашаюцца праз сістэму гуманітарызацыі інжынернай адукацыі. Таму ў навучальных планах побач з тэхнічнымі дысцыплінамі стаяць родная і замежныя мовы, беларусазнаўства, гісторыя, педагогіка, сусветная культура і філасофія. Усе яны з'яўляюцца кампанентамі адзінай сістэмы і ствараюць пераемнасць чытаемых курсаў, што ў сваю чаргу ўзмацняе іх мэтанакіраванасць на чалавечы фактар. З цягам часу ў студэнтаў фарміруецца патрэба ў пастаянным узбагачэнні сваіх ведаў.

Разгледзім, якія магчымасці для развіцця асобы студэнта дае курс беларускай мовы ў тэхнічным вузе.

Вядома, што мова з'яўляецца сродкам зносін у межах пэўнай культуры і не можа быць асвоена ў адрыве ад гэтай культуры. Таму найпершая ўвага пры вывучэнні беларускай мовы надаецца знаёмству студэнтаў з лепшымі ўзорамі нацыянальнай спадчыны (у галіне выяўленчага мастацтва, дойлідства, музыкі, літаратуры і навукі). Такая пазіцыя мае вялікае выхаваўчае значэнне, бо дазваляе ўбачыць каштоўны уклад беларусаў у агульную скарбніцу сусветнай культуры. Павага да свайго народа ў далейшым будзе праяўляцца праз адказныя адносіны чалавека да сваёй гісторыі, прыроды і людзей.

Магчымае звужэнне курса беларускай мовы да пласта прафесійнай лексікі, безумоўна, паглыбіць веды студэнтаў у галіне сваёй спецыяльнасці. Але пры гэтым знікае магчымасць уплываць на станаўленне асобы з яе маральна-духоўнымі поглядамі на жыццё. У гэтым выпадку шмат што страчвае чалавек, грамадства і, зразумела ж, Бацькаўшчына.

***М.У.Буракова, З.У.Шведава***
г.Гомель

# АБ ПАВЫШЭННІ ПІСЬМЕННАСЦІ СТУДЭНТАЎ

Праца са студэнтамі розных факультэтаў нефілалагічных спецыяльнасцей дазволіла заўважыць і вызначыць тыповыя недахо-